Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 16 (525) Субота, 11 мая 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы

# Май — месяц святочны

Успомніце, з якой нецярплівасцю мы чакалі вясну, сонца, зелень дрэў! Цяпер мы ўсміхаемся ласкавым промням сонца, блакітнаму небу, вясёлым птушкам. Мы ўсміхаемся маю. Як гэта заўсёды бывае, доўгачаканае свята надышло неяк непрыкметна і... нечакана. Прачнуліся аднной цудоўнай раніцай, а з рэпрадуктара чуем голас: «Добрай раніцы, таварышы. Сёння 1 Мая 1963 года. Віншуем вас са святам!».

Сёлета 1 Мая ўпершыню сустрэлі аднной сям'ёй шэсць маленькіх дрэўцаў, сімвал непарушнай дружбы і адзінства дзяцей розных народаў. У гісторыю універсітэта назаўсёды ўвойдуць імёны беларуса Уладзіміра Атрошчанкі, кубінца Антоніо Кабальера, кангалезца Бейя Клода, кенійца Роберта Кейге, паляка Васіля Сакоўскага, кубінца Рамона Марсаля Меса. Гэта яны пасадзілі гэтыя дрэўцы, паклаўшы пачатак «Алеі дружбы» і разам з ёй цудоўнай традыцыі студэнтаў універсітэта. «Алея дружбы» будзе расці з кожным годам і гэта будуць не шэсць маленькіх дрэўцаў, а цудоўны зялёны сад.

Цяжка расказаць аб усіх падзеях мая. Першамайскае свята вылілася ў яркую дэманстрацыю непарушнага адзінства, згуртаванасці і салідарнасці працоўных усіх краін. Сёлетні Першамай разам з савецкім народам святкаваў легендарны Фідэль Кастра, правадыр кубінскай рэвалюцыі.

Праз некалькі дзён, 5 мая, споўнілася 145 год з дня нараджэння Карла Маркса. Пад сцягам марксісцка-ленінскага вучэння ідуць цяпер амаль 90 марксісцка-ленінскіх партый, якія аб'ядноўваюць у сваіх радах 42,5 мільёна чалавек. У наш век з асаблівай сілай гучыць заклік Маркса і Энгельса: «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!». Для камуністаў гэты заклік — свяшчэнны, адзінства міжнароднага камуністычнага і рабочага руху ім даражэй за ўсё.

5 мая святкавалі свой дзень шматлікія атрады савецкай прэсы, 7 мая краіна адзначала Дзень радыё.

9 мая, Свята перамогі, горад сустрэў дзесяткамі, сотнямі, тысячамі кветак. Мінчане ішлі да помніка на плошчы Перамогі, каб ушанаваць памяць герояў, аддаўшых сваё жыццё за свабоду і незалежнасць краіны. А ўвечары сталіца Беларусі салютавала ў гонар васемнаццатай гадавіны з дня перамогі над фашысцкай Германіей.

# ПЕРШАМАЙСКІЯ ВІНШАВАННІ

Да першамайскага свята ў адрас нашага універсітэта паступілі шматлікія віншаванні.

У віншавальнай тэлеграме на імя рэктара БДУ Антона Нікіфаравіча Сеўчанкі Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Васіль Іванавіч Казлоў піша:

«САРДЭЧНА ВІНШУЮ ВАС, ДАРАГІ АНТОН НІКІФАРАВІЧ, КАЛЕКТЫЎ УНІВЕРСІТЭТА З ПЕРШАМАЕМ — ДНЕМ МІЖНАРОДНАЙ САЛІДАРНАСЦІ ПРАЦОЎНЫХ. ЖАДАЮ ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКАМУ САСТАВУ, СТУДЭНТАМ, АСПІРАНТАМ, УСІМ РАБОТНІКАМ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ДАЛЕЙШЫХ ПОСПЕХАЎ У ВУЧОБЕ, ПРАЦЫ НА КАРЫСЦЬ НАШАЙ ЛЮБІМАЙ РАДЗІМЫ, БУДУЮЧАЙ КАМУНІЗМ. ВАМ АСАБІСТА, ВАШАЙ СЯМ'І ШЛЮ САМЫЯ САРДЭЧНЫЯ ПАЖАДАННІ МОЦНАГА ЗДАРОЎЯ, ШЧАСЦЯ, НОВЫХ ПОСПЕХАЎ У ВЫСАКАРОДНАЙ ПРАЦЫ. В. КАЗЛОЎ».

Віншаванні ў гонар свята 1 Мая прыслалі:

Саветнік Пасольства Дэмакратычнай рэспублікі В'етнам у СССР Тонг Хыу Зунг,
Другі Сакратар Пасольства Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам ў СССР Дао Ван Ням,
Міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі БССР,
Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па каардынацыі навукова-даследчых работ,
Старшыня Дзяржаўнага Камітэта па справах архітэктуры і будаўніцтва БССР У. А. Кароль,
Беларускі дзяржаўны праектны інстытут «Белдзяржпраект»,
студэнты падрыхтоўчага факультэта БДУ.
Вільнюскі універсітэт імя В. Капсукаса,
Варонежскі універсітэт,
Горкаўскі універсітэт імя М. І. Лабачэўскага,
Дагестанскі універсітэт імя У. І. Леніна,
Далёкаўсходні універсітэт,
Кіеўскі ордэна Леніна універсітэт імя Т. Р. Шаўчэнкі,
Кіргізскі універсітэт,
Латвійскі універсітэт імя Пятра Стучкі,
Маскоўскі ордэна Леніна і ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэт імя М. В. Ламаносава,
Петразаводскі універсітэт,
Самаркандскі універсітэт імя А. Наваі,
Саратаўскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэт імя М. Г. Чарнышэўскага,
Таджыкскі універсітэт імя У. І. Леніна,
Ташкенцкі універсітэт імя У. І. Леніна,
Ужгарадскі універсітэт,
Чарнавіцкі універсітэт,
Якуцкі універсітэт,
Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі,
Беларуская ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчая акадэмія,
Гродзенскі медыцынскі інстытут,
Данецкі політэхнічны інстытут,
Мінскі медыцынскі інстытут,
Мінскі педагагічны інстытут замежных моваў,
Мінскі педагагічны інстытут імя А. М. Горкага,
Чалябінскі політэхнічны інстытут,

Шматлікія віншаванні атрымалі таксама кафедры, факультэты, грамадскія арганізацыі нашага універсітэта.

Ад імя калектыву Белдзяржуніверсітэта рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» шчыра дзякуе ўсім нашым сябрам, якія прыслалі віншаванні да свята 1 Мая.

Мікола МАЛЯЎКА

## СЕСІЯ

На кансультацыях раімся,
Уплятаем батон сухі.
І паўгода збіраемся,
Каб студэнцкія здаць «грахі».
Баімся —
зрываліся з лекцыі —
Акадэмікаў і дактароў,
Як баяцца аўтаінспекцыі
Вадзіцелі без правоў.

Заблудзіліся ў памяці правілы,
Падарожнічаюць гарады.
На здавальняюча плаваюць
«Рэкардсмены» туды і сюды.
Ураўненні з памылкамі пішуцца,
Аддаляюцца берагі —
Дадатковых пытанняў
калышуцца
Выратавальныя кругі.

Пагарэлі —
глядзім аптымістамі,
І атрымліваецца наадварот:
Б'е аб успамінаў выступы
Перажыты вадаварот.
Спускаемся ў цёплыя кратэры,
Прыводзім цытаты з тамоў,
І ўздыхаюць экзаменатары —
Не паспеюць
к абеду дамоў.

# Кубінскія госці ў Мінску

У Мінску гасціла партыйная дэлегацыя Кубы на чале з намеснікам дырэктара Упраўлення школ рэвалюцыйнага выхавання Рэспублікі Куба Карласам Гансалесам Эрэра. Госці азнаёміліся з выдатнымі мясцінамі сталіцы Беларусі, пабывалі ў Доме-музеі І з'езда РСДРП, у Мінскім прамысловым абкоме партыі, на Мінскім трактарным заводзе, у хлебаробаў сельгасарцелі імя Гастэлы, на Мінскім гадзіннікавым заводзе, у Мінскай вышэйшай партыйнай школе.

Члены партыйнай дэлегацыі Кубы пабывалі і ў нас, у Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна. Яны сустрэліся тут са сваімі землякамі, студэнтамі падрыхтоўчага факультэта і першых курсаў фізічнага і хімічнага факультэтаў.

Затым госці мелі гутарку з рэктарам БДУ акадэмікам А. Н. Сеўчанкам і атрымалі вычарпальныя адказы на пастаўленыя пытанні.

Вечарам у гонар гасцей сіламі мастацкай самадзейнасці універсітэта і горада, з удзелам артыстаў быў дадзен вялікі канцэрт.

# 36 высакародных сэрцаў

Вялікая група студэнтаў нашага універсітэта: Г. Паўлаў, А. Дзеравянец, Г. Якубоўскі, Е. Сушко, В. Журко, С. Дзмітрыеў, Н. Кучыцкі, В. Сазонаў, Т. Шкляр, І. Гайдукоў, Н. Лешанюк, І. Сягло, В. Казлоў, В. Сляпкоў, І. Саўчанка, Л. Раманоўская (фізічны факультэт), Л. Баразна, А. Кавалёў, Л. Рамашка, А. Будзіч, І. Урублеўскі, Т. Меркушава, І. Трухан, В. Карзюк, С. Кандрацьева (матэматычны факультэт), М. Кулікава, Т. Пятрова, В. Ледзенеў, Э. Ясны, В. Бабініч, П. Сушко (філалагічны факультэт), В. Шапурка, І. Апон, І. Вайцянкоў, В. Смоляк (юрыдычны факультэт) і В. Пудзіноўская (геаграфічны факультэт) — зрабіла высакародны ўчынак, які сведчыць аб іх высокім пачуцці сацыялістычнага гуманізма. Гэтыя 36 юнакоў і дзяўчат бясплатна далі сваю кроў для лячэбных мэт. Па хадайніцтву загадчыцы здраўпункта універсітэта тав. Мазавай, загадам рэктара ўсім 36 студэнтам аб'яўлена падзяка.

# Універсітэт за тыдзень

* * *

З 6 па 10 мая ў нашым універсітэце праходзіла X навуковая канферэнцыя па ўнутраных вадаёмах Прыбалтыкі, арганізаваная Дзяржаўным камітэтам па рыбнай гаспадарцы пры СНГ СССР, Беларускім дзяржаўным універсітэтам імя У. І. Леніна, Аддзелам заалогіі і паразіталогіі АН БССР і Беларускім навукова-даследчым інстытутам рыбнай гаспадаркі. У рабоце канферэнцыі, акрамя беларускіх вучоных, удзельнічаюць прадстаўнікі ВНУ і навуковых устаноў Ленінграда, Вільнюса, Рыгі, Петразаводска, Тарту, Пскова, Севастопаля, Вялікіх Лук, Масквы і іншых гарадоў краіны.

* * *

Новыя кніжныя выстаўкі наладзіла бібліятэка універсітэта. Экспазіцыі прысвечаны Дню друку, Дню радыё, Святу перамогі. На трэцім паверсе арганізавана кніжная выстаўка, прысвечаная 145-годдзю з дня нараджэння Карла Маркса. Яшчэ адна кніжная выстаўка называецца «Свабодная Куба»; на ёй экспануецца літаратура аб востраве свабоды.

* * *

Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна аб'явіў чарговы набор на завочнае навучанне па наступных спецыяльнасцях: гісторыя, філасофія, правазнаўства, беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура, журналістыка, матэматыка, біялогія, геаграфія.

* * *

У аўторак, 7 мая, адбылася 15 лекцыя з цыкла «Майстры замежнага мастацтва». Аб творчасці Гогена, Ван-Гога, Сезана расказваў лектар — навуковы супрацоўнік Эрмітажа Е. Румель.

# Варонежскаму дзяржаўнаму універсітэту — 45 год

45 гадоў назад, 18 мая 1918 года, на калегіі Народнага Камісарыята асветы з дакладам аб арганізацыі Варонежскага універсітэта выступіў вядомы вучоны-бальшавік П. К. Штэрнберг. Тады Дзяржаўная камісія па асвеце прыняла адпаведную пастанову. Так быў пакладзены пачатак існавання Варонежскага універсітэта.

Гэтай падзеі папярэднічала эвакуацыя з Юр'ева ў Варонеж прафесарска-выкладчыцкага саставу і абсталявання вядомага Юр'еўскага універсітэта. Дзейны ўдзел у стварэнні першай у Чарназёмным краі вышэйшай навучальнай установы прыняў прафесар усеагульнай гісторыі В. Э. Рэгель, які пасля стаў першым рэктарам Варонежскага універсітэта. 25 чэрвеня з Юр'ева ў Варонеж прыбыў першы эшалон, потым яшчэ адзін. Усяго ў Варонеж пераехала каля 40 прафесараў і каля 80 супрацоўнікаў. У ВНУ было адкрыта пяць факультэтаў: медыцынскі, фізіка-матэматычны, юрыдычны, гісторыка-філалагічны, фармацэўтычны, на якіх навучалася больш 7 тысяч чалавек.

З таго часу прайшло 45 гадоў. Варонежскі універсітэт ператварыўся ў адну з буйнейшых ВНУ краіны. Штогод у народную гаспадарку ідуць працаваць выпускнікі 27 спецыяльнасцей. У ВДУ працуюць вядомыя вучоныя, высокакваліфікаваныя выкладчыкі. З кожным годам расшыраецца матэрыяльная база універсітэта, павялічваецца прыем студэнтаў. Усё гэта ярка сведчыць аб клопатах партыі і ўрада аб развіцці навукі.

(З артыкула Д. Чаромухіна ў газеце «Воронежский университет» № 30 за 1963 год).

# Творчая лабараторыя журналістаў

— Таварыш Макавец, чым вы сёння парадуеце нас? — запытаў выкладчык.

— Пакуль што нічым, — адказаў Коля коратка.

— А ўсё ж задума якая-небудзь ёсць?

— Наклёўваецца.

— А што іменна наклёўваецца?

І Мікалай расказаў, што ён збіраецца напісаць аб адной бабулі, якая ў глыбокую старасць перастала верыць у бога. А некалькі гадоў назад яна была зусім іншай і нават павесіла юнаку, што ішоў у армію, на шыю крыжык ды яшчэ блаславіла яго. Мікалай расказаў аб тых зменах, што адбыліся ў вёсцы за апошнія гады, аб думках, якімі жывуць цяпер аднавяскоўцы бабулі. А калі скончыў, выкладчык зазначыў:

— У Вас цудоўная задума, а факты могуць паслужыць тэмай для нарыса. Толькі патрэбна будзе падыйсці вельмі асцярожна да распрацоўкі тэмы. Зразумела, не кнігі маглі зрабіць такі перакананы ўплыў на свядомасць старога чалавека. Трэба адшукаць сапраўдную прычыну, якая падзейнічала на светапогляд бабулі.

Пэўна, вялікае значэнне мае тут змяненне ўсяго аблічча сучаснай вёсцы. У кожнай хаце гучыць радыё, на палях працуюць трактары, людзі цяпер жывуць багата. А з якім хваляваннем слухалі сельскія працаўнікі паведамленні аб заваёвах касмічнай прасторы савецкай навукай!

Адзін за другім выказваюцца аднакурснікі Мікалая. Віктар Гацура, Саша Мураўёў і іншыя прапанавалі Макаўцу свае варыянты пачатку матэрыяла.

Змястоўны матэрыял напісалі Іван Фіцнер і Іван Кацановіч. Тэмай яго былі прычыны безгаспадарчасці кіраўнікоў аднаго з калгасаў Капыльскага раёна. Аўтары расказвалі аб недахопах у нарыхтоўцы кармоў у мінулым годзе. Але пры разборы выявілася, што яны не здолелі правільна нацэліць свой матэрыял, глыбока раскрыць факты, часта ўхіляліся ад тэмы. Шмат нараканняў выклікала і назва матэрыяла. Студэнты доўга абмяркоўвалі артыкул Фіцнера і Кацановіча, далі аўтарам шмат карысных парад.

Галя Часлаўская напісала аб урачу, якая выратавала жыццё пяцігадовай дзяўчынцы. Тут таксама аднакурснікі выявілі некаторыя недахопы. Галя больш расказала аб дзяўчынцы, чым аб сапраўднай гераіні нарыса.

На іншых занятках будучыя журналісты разбіралі матэрыял Віктара Вяжнаўца « Адкуль бяруць шкло?», апублікаваны ў «Мінскай праўдзе». Вельмі трапна Віктар выкрывае аматараў лёгкай нажывы.

Час ідзе. З вялікімі цяжкасцямі выходзяць з-пад пяра першакурснікаў вячэрняга аддзялення журналістыкі новыя матэрыялы. Няўхільна расце майстэрства будучых журналістаў. Усё часцей на старонках газет сустракаюцца іх матэрыялы — вынік карпатлівай і настойлівай працы.

Магчыма, не адну няўдачу зведаюць яшчэ многія з іх перад тым, як іх матэрыял трапіць на газетныя старонкі. І ўсё ж гэта не павінна пасабляць сілы, уносіць расчараванасць, няўпэўненасць у душу студэнта.

Галоўнае іншае: любіць сваю прафесію, любіць горача. А для гэтага трэба пісаць больш, пісаць проста і даходліва. Майстэрства даецца чалавеку цаной вялікіх намаганняў. Адточваць, удасканальваць майстэрства журналіста — такая мэта гэтых размоў, спрэчак ва універсітэцкай аўдыторыі.

**Мікалай РАМАНОЎСКІ,**
студэнт 1 курса вячэрняга аддзялення журналістыкі, выкладчык працы 27-й сярэдняй школы г. Мінска.

# „Вогненная камета"

## (Аб кнізе вершаў Васіля Макарэвіча)

У апошнія гады ў літаратуру ўліваюцца ўсё новыя і новыя сілы. Пішуць усе: калгаснікі і рабочыя, студэнты і школьнікі. І тыя, хто з самага пачатку разумее ўсю складанасць працы над словам, хто імкнецца па-свойму ўзбагаціць паэтычную думку, унесці ў мастацтва сваё, асаблівае, тыя ідуць у вялікую літаратуру.

Па вершах маладога аўтара, студэнта 4 курса аддзялення журналістыкі нашага універсітэта **Васіля Макарэвіча**, бачна, што за яго плячыма нялёгкі шлях пошукаў. Гэты шлях яшчэ не скончаны, пяру аўтара прадстаіць яшчэ шмат выпрабаванняў.

Сёлета ў Белдзяржвыдавецтве выйшла невялікая кніжка вершаў Васіля Макарэвіча «Вогненная камета». У ёй — 20 вершаў. Паспрабуем коратка прааналізаваць іх.

«Вогненная камета». Гэтым вершам адкрываецца зборнік, гэты верш даў назву кнізе. У аснову пакладзена касмічная з'ява прадвечных гадоў— з'яўленне ў небе каметы. Набожныя людзі ў гэтым бачылі нябеснае знаменне. Але ў вершы Макарэвіча асноўнае не гэта. Матыў каметы ён перапрацоўвае. Са з'яўленнем яе знікаюць пакуты нараджаючай маці, і ў той жа час пачынаюцца нечалавечыя выпрабаванні для ўсяго народа— вайна. Гіпербалізуючы, аўтар вядзе сваю думку далей. Другая камета — магутнае, пераможнае «ура!». Людзі чакалі, і час здзяйснення мары надышоў:

*І грымнула. У полымі зарніц*
*зямля ад краю ў край*
*гула і вохкала.*
*І бацьку я крычаў:*
*— Глядзі, ляціць*
*мая камета залатая,*
*вогненная.*

У другім вершы «Як судна перахрысціць краны» паэт малюе светлы вобраз працоўнага чалавека. Усё ў чалавеку простае — і звычкі, і асаблівасці. Чалавек хоча жыць і стварыць. Гэтую думку аўтару ўдаецца пераканаўча давесці да свядомасці чытача. Жменя травы, пакладзенай паміж цюкоў у трум карабля, —гэта сімвал вечна зялёнай зямлі, сонца і блакітнага неба. Ідэя сімвала зразумела ўсім людзям усіх кантынентаў. Хвалюе чытача канцоўка верша — лагічнае заключэнне аўтара. У другім порце на судна прыдуць грузчыкі, пачнуць працу. І абавязкова заўважаць сяброўскае прывітанне з міралюбівай краіны. І тады:

*Пачнуць*
*у суш і лівень брацца*
*сюды паломнікі здаля,*
*каб хоць адчуць,*
*як пахне брацкая,*
*ім гэтак родная зямля!*

Гэты вобраз — знаходка аўтара, добрая знаходка. Здаецца, ён валодае асноўным —уменнем «стругаць рыфму», як гаварыў некалі Уладзімір Маякоўскі.

У вершы «Пяскі» — вечная мара чалавека да палётаў. Гэтая мара —сама гісторыя, складаны шлях пошукаў бяскрылага чалавека. Мара чалавека была нітачкай у руках хлапчукоў, запусціўшых ў неба змея, нітачкай, якая звязвала іх сэрцы з небам. Людзі рыхтавалі сябе да вялікага, і вось ракета

*Крутой сваёй арбітай*
*сівыя вёрсты мерыць.*
*А дыму ў небе нітка,*
*як успамін пра змея..*

«Аэрадромы — люстры на зямлі...», «Упартасць», «Зямля мне візу ў неба выдае...», «А год стары ў сваіх лугах...», «Вернасць», «Мая радаслоўная». У кожным з гэтых вершаў малады паэт стараецца паказаць свайго лірычнага героя чалавекам простым, шчырым, патрабавальным да сябе і да іншых. Яго герою жыццё не высцілае дарогу зяленню і кветкамі. Да ўсяго ён даходзіць сам, сваімі пачуццямі, розумам, сэрцам. Гэты сціплы лірычны герой і кахае, і ненавідзіць да апошняга. Ён прагне шчасця, і гэтая прага запальвае сэрца чытача, напамінае, вядзе, кліча.

Жыццё! Яно, як промні ў лінзе, праламляецца ў сэрцы аўтара, факусіруецца ў думках паэта. Калі б не было гэтага, не было б паэзіі, вобразаў. Як геолаг разглядае кавалак пароды, так паэт бярэ на далоні, спрабуе на смак, пах, на цвёрдасць і моц кожны кавалак жыцця, потым гадзінамі, днямі, гадамі выпрабоўвае яго ў лабараторыі свайго сэрца.

У вершы Васіля Макарэвіча ёсць шмат знаходак, самародкаў-вобразаў. Нельга без карпатлівай працы і назірання вызначыць нешта асаблівае, характэрнае. Ці ж не аб гэтым сведчаць заключныя радкі верша «Студня?»

*...глыбей чым выкапаеш студню,*
*тым будзе і вада смачней.*

Толькі па адной фразе верша «Аэрадромы...» ўяўляецца чытачу лютая студзеньская зіма:

*Мароз такі смаліў, што аж гудрон*
*на полі лётным, нібы стрэл той, лопаўся.*

Чаруе чытача і вобраз зімы ў вершы «А год стары...», дзе «віхура» параўноўваецца са «сваццёй», дзе вецер «шаўкі мяцеліц не раскручваў», зберагаючы, як вясельныя ручнікі, «зіме са снежнем на заручыны».

Верш «Вернасць» — гімн сапраўднаму сяброўству. Колькі ўжо гаварылася пра каханне, і ўсё ж аўтар здолеў своеасабліва падкрэсліць значэнне кахання для чалавека.

Зборнік — гэта нейкая частка біяграфіі паэта. Пабач з удачамі і знаходкамі, побач з пошукамі і рашэннямі ёсць і слабасці душэўныя і паэтычныя. Цыкл гэтых прызнанняў пачынаецца вершам «Я ўвесь у болі ў муках...» і рассыпаецца шэрагам думак і вобразаў у іншых вершах.

У сваім асабістым жыцці аўтар кіруецца часам, як ён піша, не думкай, а пачуццём, інтуіцыяй. Асабістае чуецца нават у некаторых вобразах: «Глыбокую капалі студню—нарасхрыст грудзі — ўсім сялом». Гэтае «нарасхрыст грудзі» адрасу выклікае пачуццё разудаласці і паказухі. Ці ж так працуюць сціплыя працаўнікі? Іншая справа, калі ад жаркай працы людзі расшпільваюць сарочкі. Але ж аб гэтым сказаць трэба па-іншаму.

Выклікае сумненне і такое параўнанне:

*Аэрадромы —*
*люстры на зямлі.*
*Зямлі далоні —*
*то аэрадромы...*

Чаму? Чым выклікае аэрадром такія вобразы? Формай, выглядам, бляскам, ззяннем? Калі і ёсць падабенства з люстрай, то не ў зімовы час мяцеліц і снегападаў, які апісан у вершы.

У якасці папрока аўтару можна давесці і наступнае: калі ў цэлым зборнік яго вершаў і добры, але ў ім ёсць і вельмі слабыя вершы, як «Бохан хлеба», напрыклад. І наогул гэта зборнік касмічных вобразаў. Аўтар занадта мала напісаў пра нашу старую і вечна маладую прыгажуню-зямлю.

**А. АМЕЛЬЧАНКА,**
**У. МАНГІНОВІЧ.**

# Фізкультура і спорт

## Я. Кухарчук і Ю. Струк— кандыдаты ў майстры

Увесь красавік працягвалася 9 асабістае першынство універсітэта па шашках. Яно праводзілася па швейцарскай сістэме ў 10 тураў і сабрала рэкордную колькасць удзельнікаў — 58. Дастаткова сказаць, што ў паўфіналах першынства горада ўдзельнічалі 47 шашыстаў. Па палажэнню, зацверджанаму шашачнай федэрацыяй БССР, тром пераможцам прысвайваліся кандыдацкія балы.

З першага ж тура разгарнулася вострая барацьба. Пасля 6 тураў лідзіраваў студэнт 3 курса матфака Ю. Струк, не згубіўшы ніводнага ачка. Бліжэйшыя канкурэнты адставалі ад яго на паўтара ачка. І ў момант, калі да перамогі было рукой падаць, здарылася непрадбачанае. У 7 туры ў выйгранным эндшпілі з П. Несцяровічам Струк прагледзеў прыгожы камбінацыйны ўдар з ахвярай дамкі і вымушан быў згадзіцца на нічыю. У 8 туры ён сустрэўся з сваім аднакурснікам Я. Кухарчуком, якому дагэтуль ніколі не прайграваў. Але традыцыя была парушана, і Кухарчук зраўняўся па ачках з лідарам.

У 9 туры абодва лідары перамагаюць сваіх супернікаў, і лёс першага месца рашаў апошні тур. Пасля напружанай барацьбы партыя Ю. Струк — А. Абрамовіч закончылася унічыю, а Я. Кухарчук перамог Н. Рафальскага, і 8,5 ачка зноў забяспечылі яму званне чэмпіёна БДУ. Адначасова Я. Кухарчук выканаў нарматыў чацвёртага кандыдацкага бала, г. зн. перавыканаў норму для кандыдата ў майстры. Ю. Струк набраў трэці кандыдацкі бал. Такім чынам сям'я шашыстаў універсітэта папоўнілася адразу двумя кандыдатамі ў майстры. З месца заняў хутка прагрэсіруючы Несцяровіч (матфак), ён выканаў другі кандыдацкі бал. Гэта—адзіны ўдзельнік першынства, які не прайграў ніводнай партыі.

На закрыцці першынства чэмпіён даў сеанс адначасовай ігры на 25 дошках для ўдзельнікаў першынства. 15 перамог, 7 нічыіх і толькі 3 паражэнні — такі вынік сеанса.

Затым адбыўся вялікі бліц-турнір. Перамог зноў Я. Кухарчук, які набраў 32,5 ачка з 39 магчымых. На другім месцы Г. Драбушэвіч з 29 ачкамі, на трэцім —П. Несцяровіч — 28,5 ачка.

**Генадзь ДРАБУШЭВІЧ.**

## На прыз „Чырвонай змены"

Двойчы на вышэйшую ступеньку п'едэстала гонару выходзілі спартсмены універсітэта ў кросе на прыз газеты «Чырвоная змена». Анна Лаўруковіч-Базылева перамагла на дыстанцыі 1000 метраў. Яе вынік 3 мінуты 14,8 секунды. На трэцім месцы студэнтка матфака БДУ Генрыета Мольдэнгауэр.

У мужчын на дыстанцыі 3000 метраў пераможцам было адразу два: інструктар фізкультуры Віктар Сідараў і выпускнік гістфака універсітэта Мікалай Базылеў. Іх час — 8 мінут 54,4 секунды.

## Праўдзінскі крос

24 і 26 красавіка адбыўся фінал універсітэцкага кросу, прысвечанага 51-й гадавіне газеты «Праўда». Яму папярэднічалі масавыя кросы на факультэтах, якія па колькасці ўдзельнікаў і выкананню разрадных нарматываў пераўзышлі ўсе папярэднія кросы.

У фінальных забегах з 154 мужчын нормы 1, 2 і 3 разрадаў выканалі 111, з 138 жанчын —45. У агульнакамандным заліку перамаглі спартсмены гістарычнага факультэта. На другім месцы —2 каманда фізічнага факультэта, і на трэцім — матэматыкі. Трэба адзначыць, што гісторыкі ўстанавілі своеасаблівы рэкорд: усе студэнты факультэта, якія ўдзельнічалі ў фінальных забегах, выканалі разрадныя нарматывы.

У мужчын дыстанцыю 3000 метраў з аднолькавым часам 8 мінут 30 секунд закончылі адразу тры спартсмены: Генадзь Пінчук, Мікола Базылеў і Аляксандр Папоў — усе з гістфака. Іх вынік— вышэй нормы 1 разраду.

Жанчыны спаборнічалі на дыстанцыі 1000 метраў. Лепш іншых прабегла гэтую дыстанцыю студэнтка матфака Генрыета Мольдэнгауэр (3 мінуты 10 секунд). На другім месцы — Анна Лаўруковіч (гістфак), на трэцім — **Ольга Філіповіч (хімфак).**


## Зручна, надзейна, выгадна...

У снежні мінулага года споўнілася сорак гадоў з часу арганізацыі ў нашай краіне дзяржаўных працоўных ашчадных кас. За гэтыя гады ашчадныя касы заваявалі вялікую папулярнасць і аўтарытэт у насельніцтва.

Мільёны савецкіх грамадзян — рабочых, служачых, калгаснікаў, карыстаючыся паслугамі ашчадных кас для захоўвання і накаплення грашовых сродкаў, на сваім асабістым вопыце пераконваюцца, што гэта дапамагае ім больш правільна будаваць асабісты бюджэт, больш мэтанакіравана выкарыстоўваць працоўныя даходы для задавальнення сваіх матэрыяльных і культурных запатрабаванняў.

За апошнія гады вялікае распаўсюджанне атрымала пералічэнне часткі заработнай платы ў ашчадныя касы. Падаўшы заяву ў бухгалтэрыю сваёй установы або прадпрыемства, можна шляхам штомесячных пералічэнняў накапіць грашовыя сродкі на ашчадных кніжках, каб потым выкарыстаць іх для пакупкі каштоўных рэчаў. На жаль, гэты від зберажэнняў дагэтуль яшчэ не атрымаў шырокага распаўсюджання ў нашым універсітэце з-за недастатковай растлумачальнай работы.

Укладчык можа атрымоўваць даход па ўкладах ў відзе працэнтаў або выйгрышаў, ён можа выдаць даверанасць на атрыманне ўклада, завяшчаць уклад любой асобе або арганізацыі, папоўніць або атрымаць свой уклад не толькі ў ашчаднай касе, якая выдала ашчадную кніжку, але таксама і ў цэнтральнай касе свайго раёна або горада.

Савецкая дзяржава гарантуе тайну ўкладаў, іх захаванасць і выдачу па першаму патрабаванню ўкладчыка.

УНАСІЦЕ УКЛАДЫ У АШЧАДНЫЯ КАСЫ!

**У. Л. КОРХАЎ,**
галоўны бухгалтар Белдзяржуніверсітэта.



Рэдактар **У. КУЛАЖАНКА.**

**Адрас рэдакцыі:**
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 03847. Тыр. 2000 Зак. 1718.